“Vydáno s podporou Ministerstva zahraničních věcí České republiky“

Выдадзена пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў Чэшскай Рэспублікі

„Neautorizovaný překlad“

Неафіцыйны пераклад.

Арганізацыя Аб'яднаных Нацый

Эканамічная і Сацыяльная Рада

E/CN.4/2005/L.32
12 April 2005
BELARUSIAN
Original: ENGLISH

# КАМІСІЯ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

Шэсцьдзесят першая сесія
Пункт 9 павесткі дня

ПЫТАННЕ АБ ПАРУШЭННІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА І АСНОЎНЫХ СВАБОД У ЛЮБОЙ ЧАСТЦЫ СВЕТУ

Албанія[1], Аўстралія, Аўстрыя*, Бельгія*, Балгарыя*, былая Югаслаўская Рэспубліка Македонія, Венгрыя, Германія, Грэцыя*, Данія*, Аб'яднанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі, Злучаныя Штаты Амерыкі, Ірландыя, Ізраіль*, Італія, Канада, Кіпр*, Латвія*, Літва*, Ліхтэнштэйн*, Люксембург, Мальта, Нарвегія, Нідэрланды, Польшча, Партугалія, Румынія, Славакія, Славенія, Фінляндыя, Францыя, Харватыя*, Чэшская Рэспубліка*, Швейцарыя, Швецыя і Эстонія*: Р Э З А Л Ю Ц Ы Я

**13/2005 Сітуацыя ў галіне правоў чалавека ў Беларусі**

*Камісія па правах чалавека,*

*кіруючыся* мэтамі і прынцыпамі Хартыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, палажэннямі Ўсеагульнай Дэкларацыі Правоў Чалавека ды іншымі дамовамі па правах чалавека, якія могуць быць выкарыстаныя,

*зноў пацвярджаючы*, што ўсе дзяржавы-сябры абавязаныя заахвочваць і абараняць правы чалавека і падставовыя свабоды і выконваць свае міжнародныя абавязацельствы,

*памятаючы* пра тое, што Беларусь з'яўляецца ўдзельнікам Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах і Факультатыўнага пратакола да яго, Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, Міжнароднай канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх форм расавай дыскрымінацыі, Канвенцыі супраць катаванняў ды іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжаючых відаў абыходжання і пакарання, Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх

[1] У адпаведнасці з пунктам 3 правіла 69 правілаў працэдуры функцыйных камісій Эканамічнай і Сацыяльнай Рады

форм дыскрымінацыі жанчын і Факультатыўнага пратакола да яе і Канвенцыі аб правах дзіцяці і Факультатыўнага пратакола да гэтай Канвенцыі, які датычыцца гандлю дзецьмі, дзіцячай прастытуцыі і дзіцячай парнаграфіі,

*спасылаючыся* на свае рэзалюцыі 2003/14 ад 17 красавіка 2003 года і 2004/14 ад 15 красавіка 2004 года,

*вітаючы* візіт Працоўнай Групы па адвольных затрыманнях,

*памятаючы* аб запытах, зробленых ураду Беларусі Працоўнай Групай па гвалтоўных і недабраахвотных знікненнях наконт знікнення былога міністра ўнутраных спраў Юрыя Захаранкі,

*адзначаючы* высновы і рэкамендацыі Камітэта супраць катаванняў адносна трэцяй перыядычнай справаздачы Беларусі, якія ўтрымліваюцца ў справаздачы Камітэта аб працы дваццаць пятай і дваццаць шостай ягоных сесій (A/56/44), і рэкамендацыі, якія ўтрымліваюцца ў справаздачы Спецыяльнага дакладчыка па пытанні незалежнасці суддзяў і адвакатаў аб ягонай паездцы ў Беларусь (E/CN.4/2001/65/Add.1), а таксама адсутнасці прагрэсу з боку ўраду Беларусі ў зняцці адзначаных недахопаў,

1. *выказвае глыбокую заклапочанасць:*

a) у сувязі з тым, што найвышэйшыя службовыя асобы ўраду Беларусі мелі дачыненне да гвалтоўнага знікнення і/або пакарання смерцю без належнага судовага разбіральніцтва трох палітычных апанентаў цяперашняй улады ў 1999 годзе і аднаго журналіста ў 2000 годзе і ўтойвання інфармацыі аб ходзе следства, якое працягваецца, што дакументальна пацверджана ў справаздачы Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы, зацверджанай Рэзалюцыяй 1371 ад 28 красавіка 2004 і ўхваленай Камітэтам Міністраў Рады Еўропы 30 верасня 2004 года;

b) з нагоды высноваў выніковай справаздачы Місіі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе па назіранні за выбарамі ад 9 снежня 2004 года, у якой гаварылася, што парламенцкія выбары ў Беларусі 17 кастрычніка 2004 года ў значнай ступені не адпавядалі абавязацельствам АБСЕ, што ўрад аказваў відавочны ціск на карысць правядзення рэферэндума па прапанове аб зняцці абмежавання на тэрмін знаходжання на пасадзе прэзідэнта, які адбыўся 17 кастрычніка 2004 года, і што беларускія ўлады не змаглі стварыць умовы, у прыватнасці, датычныя свабоды слова і свабоды сродкаў масавай інфармацыі, якія забяспечылі б такое становішча, пры якім дзейнасць ураду грунтуецца на волевыяўленні народу;

c) у сувязі са справаздачай Прадстаўніка АБСЕ па пытаннях свабоды сродкаў масавай інфармацыі ад 10 сакавіка 2005 года, у якой выказваецца сур'ёзная занепакоенасць цяжкім становішчам незалежных сродкаў масавай інфармацыі Беларусі, у прыватнасці, скарачэннем колькасці рэгістрацый незалежных газет і ўзмацненнем ціску на сродкі масавай інфармацыі з дапамогай судовых, пазасудовых і эканамічных метадаў;

d) адносна высноваў, выкладзеных у справаздачы Спецыяльнага дакладчыка па пытанні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі, прызначанага ў адпаведнасці з Рэзалюцыяй 2004/14 (E/CN.4/2005/35);

e) з нагоды паведамленняў, якія працягваюцца, пра тое, што з 1 лютага 2005 года ўрад Беларусі прад'яўляе празмерныя прававыя патрабаванні і патрабуе ўнясення значных грашовых сумаў пры рэгістрацыі і выдачы дазволу на далейшую дзейнасць недзяржаўных арганізацый;

f) у сувязі з высновамі Камісіі па расследванні, створанай у адпаведнасці з артыкулам 26 Статуту Міжнароднай арганізацыі працы з мэтай высветліць, ці выконвае ўрад Рэспублікі Беларусь Канвенцыю 1948 года (№ 87) аб свабодзе аб'яднанняў і абароне права аб'ядноўвацца ў прафсаюзы і Канвенцыю 1949 года (№ 98) аб выкарыстанні права на стварэнне і заключэнне калектыўных дамоваў;

g) адносна няспынных паведамленняў аб пераследзе і закрыцці недзяржаўных арганізацый, арганізацый нацыянальных меншасцяў, незалежных сродкаў масавай інфармацыі, апазіцыйных палітычных партый, незалежных прафсаюзаў і рэлігійных арганізацый, а таксама аб пераследзе прыватных асобаў за ўдзел у дэмакратычнай дзейнасці, уключаючы незалежныя сродкі масавай інфармацыі;

h) у сувязі з адкліканнем ліцэнзіі Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта і ціскам, які працягваецца, на гэты ўніверсітэт ды іншыя навучальныя ўстановы з боку беларускіх уладаў;

i) адносна адсутнасці поўнамаштабнага супрацоўніцтва ўраду Беларусі з усімі механізмамі Камісіі, да якога Камісія заклікала ў сваіх Рэзалюцыях 2003/14 і 2004/14, у прыватнасці, са Спецыяльным дакладчыкам па сітуацыі ў галіне правоў чалавека ў Беларусі;

j) з нагоды пераследу па палітычных матывах аднаго з лідэраў апазіцыі;

k) адносна паведамленняў, якія працягваюцца, аб адвольных арыштах і затрыманнях;

2. *настойліва заклікае ўрад Беларусі:*

a) звольніць або адхіліць ад выканання службовых абавязкаў службовых асобаў правапрымяняльных органаў і дзяржаўных службоўцаў, датычных да гвалтоўных знікненняў і/або смяротных пакаранняў без належнага судовага разбіральніцтва, да таго часу, пакуль гэтыя справы не будуць старанна і цалкам даследаваныя і вінаватыя не будуць пакараныя па закону;

b) забяспечыць, каб былі прынятыя ўсе неабходныя меры для поўнага і аб'ектыўнага расследавання ўсіх выпадкаў гвалтоўнага знікнення, катаванняў, пакарання смерцю без належнага судовага разбіральніцтва, а верагодна, датычныя да гэтых злачынстваў асобы з'явіліся ў незалежным судзе і, у выпадку прызнання іх вінаватымі, былі пакараныя ў адпаведнасці з міжнароднымі абавязацельствамі Беларусі ў галіне правоў чалавека;

c) забяспечыць эфектыўную абарону правоў асобаў, пазбаўленых волі, як гэта было рэкамендавана Працоўнай Групай па адвольных затрыманнях;

d) прывесці выбарчы працэс і заканадаўчую базу ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі, асабліва стандартамі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, уключаючы тыя з іх, якія датычаць свабоды слова, забяспечыць удзел Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ ва ўсіх выбарах і даць яму магчымасць выконваць свае абавязкі перад Арганізацыяй па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе;

e) у поўнай меры выканаць рэкамендацыі і наладзіць бягучы дыялог са Спецыяльным дакладчыкам, а таксама прадстаўніком Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе па пытаннях свабоды сродкаў масавай інфармацыі;

f) спыніць пераслед недзяржаўных арганізацый, палітычных партый, прафсаюзаў, незалежных сродкаў масавай інфармацыі, навучальных установаў, рэлігійных арганізацый і актывістаў дэмакратычнага і праваабарончага руху, правесці перагляд унутраных законаў і практыкі абавязковай рэгістрацыі недзяржаўных арганізацый і забяспечыць, каб такія законы і палажэнні ажыццяўляліся або прыводзіліся ў адпаведнасць з міжнароднымі абавязацельствамі ў галіне правоў чалавека;

g) вызваліць асоб, затрыманых па палітычных матывах;

h) выканаць рэкамендацыі Камісіі па расследванні Міжнароднай Арганізацыі Працы і рэкамендацыі Працоўнай Групы па адвольных затрыманнях без далейшых затрымак;

i) захоўваць права на свабоду сходаў і аб'яднанняў;

j) прадставіць грамадству інфармацыю аб выкананні прысудаў у адносінах да асобаў, асуджаных да смяротнага пакарання;

k) узмацніць намаганні ў барацьбе з незаконным гандлем людзьмі і дапамозе ахвярам незаконнага гандлю людзьмі, у прыватнасці, жанчын, якія прадаюцца з мэтай сексуальнай эксплуатацыі;

3. *настойвае на тым*, каб урад Беларусі ў поўнай меры супрацоўнічаў з усімі механізмамі Камісіі, у тым ліку шляхам накіравання запрашэнняў Спецыяльнаму дакладчыку па сітуацыі ў галіне правоў чалавека ў Беларусі, Спецыяльнаму дакладчыку па катаваннях ды іншых відах жорсткага, бесчалавечнага або прыніжаючага абыходжання і пакарання, Спецыяльнаму дакладчыку па пакараннях смерцю без суда, без належнага судовага разбіральніцтва або адвольных пакараннях смерцю, Спецыяльнаму дакладчыку па заахвочванні і абароне права на свабоду меркаванняў і іх свабоднага выказвання і Спецыяльнаму прадстаўніку Генеральнага сакратара па становішчы праваабаронцаў, а таксама Працоўнай Групе па гвалтоўных або недабраахвотных знікненнях і шляхам просьбаў аб прадастаўленні тэхнічнай дапамогі;

4. *пастанаўляе* працягнуць яшчэ на адзін год мандат Спецыяльнага дакладчыка ў рамках існуючых рэсурсаў і просіць яго працягваць свае намаганні па ўсталяванні прамых кантактаў з урадам і народам Беларусі з мэтай вывучэння становішча ў галіне правоў чалавека і назірання за ходам распрацоўкі праграмы адукацыі ў галіне правоў чалавека для ўсіх слаёў грамадства, у прыватнасці, супрацоўнікаў правапрымяняльных органаў, супрацоўнікаў судовай сістэмы, супрацоўнікаў пенітэнцыярных установаў і грамадзянскай супольнасці і прадставіць даклад Камісіі па правах чалавека на яе шэсцьдзесят другой сесіі;

5. *просіць* Генеральнага сакратара аказваць Спецыяльнаму дакладчыку ўсю неабходную дапамогу ў выкананні мандату апошняга;

6. *пастанаўляе* разгледзець гэтае пытанне на сваёй шэсцьдзесят другой сесіі ў рамках таго ж пункта павесткі дня.

АРГАНІЗАЦЫЯ АБ'ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ

ЭКАНАМІЧНАЯ І САЦЫЯЛЬНАЯ РАДА

Distr. GENERAL

E/CN.4/2005/35
11 March 2005

BELARUSIAN
Original: ENGLISH

КАМІСІЯ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА Шэсцьдзесят першая сесія
Пункт 9 павесткі дня

ПЫТАННЕ АБ ПАРУШЭННІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА І АСНОЎНЫХ СВАБОД У ЛЮБОЙ ЧАСТЦЫ СВЕТУ

Справаздача Спецыяльнага дакладчыка па пытанні аб становішчы з правамі чалавека ў Беларусі Адрыяна Севярына*

* Дадзеная справаздача прадстаўляецца са спазненнем дзеля ўключэння ў яе найноўшых звестак.

## Рэзюмэ


Мандат Спецыяльнага дакладчыка па становішчы з правамі чалавека ў Беларусі быў вызначаны Камісіяй у яе рэзалюцыі 2004/14. У гэтай рэзалюцыі Камісія прасіла Спецыяльнага дакладчыка наладзіць прамыя стасункі з урадам і народам Беларусі дзеля вывучэння становішча з правамі чалавека ў Беларусі і назірання за любымі крокамі, скіраванымі на распрацоўку праграмы адукацыі ў галіне правоў чалавека для ўсіх слаёў грамадства, у прыватнасці, для супрацоўнікаў заканадаўчых органаў, судовай сістэмы, пенітэцыярных устаноў і грамадзянскай супольнасці і прадставіць справаздачу Камісіі на яе шэсцьдзесят першай сесіі.

Справаздача грунтуецца на фактах, устаноўленых Спецыяльным дакладчыкам падчас наведвання ім Польшчы, Літвы і Латвіі, а таксама на выніках ягоных дыскусій з прадстаўнікамі беларускіх праваабарончых арганізацый ды іншых арганізацый грамадзянскай супольнасці, у прыватнасці, Беларускага Хельсінкскага камітэта, з высокапастаўленымі службовымі асобамі Арганізацыі Аб’яднаных Нацый і спецыялізаваных устаноў, Еўрапейскай Камісіі, Еўрапейскага парламента, Рады Еўропы, Кангрэса і Дзяржаўнага дэпартамента ЗША, дыпламатамі, навуковымі супрацоўнікамі і экспертамі няўрадавых арганізацый. У справаздачу ўвайшла інфармацыя, атрыманая ім да канца лютага 2005 года.

Адмысловы дакладчык з жалем канстатуе, што ўрад Беларусі не даў станоўчага адказу на яго просьбу аб наведванні краіны і ў цэлым не пажадаў супрацоўнічаць з ім па выкананні ягонага мандата.

У справаздачы разглядаецца выкананне ў краіне асноўных свабод і правоў чалавека ў сувязі з такімі пытаннямі, як смяротнае пакаранне, знікненне людзей, катаванні, зняволенне, незалежнасць суддзяў і адвакатаў, свабода выказвання меркаванняў, сходаў, аб’яднанняў і рэлігій, а таксама палітычныя правы.

Кіруючыся сабранымі дадзенымі, Спецыяльны дакладчык прыходзіць да высновы, што пагаршэнне становішча з правамі чалавека, якое працягваецца, з’яўляецца прадметам глыбокай заклапочанасці. Ён указвае на неабходнасць ліквідацыі больш агульных першапрычын такога становішча шляхам грунтоўнага рэфармавання палітычнай сістэмы і перабудовы грамадства, адносячы да галоўных прычын аўтарытарны характар рэжыму, адсутнасць сапраўднай і жыццяздольнай грамадзянскай супольнасці і праблемы нацыянальнай самабытнасці. Ён таксама нагадвае, што геапалітычнае становішча з’яўляецца фактарам, здольным уплываць на перспектывы пераўтварэнняў і становішча з правамі чалавека ў краіне.

Спецыяльны дакладчык рэкамендуе Камісіі разгледзець, апроч іншага, магчымасць прыняцця такіх мер, як:

- распрацоўка праграмы інфармацыйна-асветніцкай працы з насельніцтвам у галіне правоў чалавека з дапамогай заснавання міжнароднага фонда для патрэбаў асветы па пытаннях правоў чалавека ў Беларусі, а таксама ўсеабдымнай праграмы падрыхтоўкі кадраў для навучання грамадзянскай супольнасці;

- далейшае аказанне тэхнічнай дапамогі і падтрымкі беларускім няўрадавым

арганізацыям і дэмакратычным палітычным партыям, а таксама арганізацыя рэспубліканскага круглага стала па пытаннях правоў чалавека ў Беларусі;

- правядзенне міжнароднай канферэнцыі па становішчы з правамі чалавека ў Беларусі, а таксама арганізацыйнае замацаванне рэспубліканскага круглага стала па правах чалавека ў Беларусі;

- заснаванне кантактнай групы па становішчы з правамі чалавека ў Беларусі для канструктыўнага дыялогу з беларускімі ўладамі, а таксама групы донараў, якія б збіралі сродкі на падтрымку розных праграм развіцця правоў чалавека ў Беларусі.

Спецыяльны дакладчык лічыць, што ў цяперашніх умовах найбольш неабходным з'яўляецца забеспячэнне свабоды сродкаў масавай інфармацыі і незалежнасці суддзяў. Таму ён рэкамендуе ўраду Беларусі, у прыватнасці:

- разгледзець пытанне аб ратыфікацыі другога Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, які ставіць за мэту адмену смяротнага пакарання, уключыць яго ва ўнутранае заканадаўства і выканаць рэкамендацыю Канстытуцыйнага суда аб адмене дадзенага пакарання;

- пачаць незалежнае празрыстае расследаванне выпадкаў знікнення дзеячоў палітычных рухаў і прыцягнуць вінаватых да адказнасці;

- запрасіць з візітам у краіну Спецыяльнага дакладчыка па катаваннях;

- цалкам выканаць рэкамендацыі Працоўнай Групы па адвольных затрыманнях, сфармуляваныя ў выніку яе візіту ў жніўні 2004 года;

- цалкам прытрымлівацца Асноўных прынцыпаў незалежнасці судовых органаў і Асноўных прынцыпаў, якія датычаць ролі юрыстаў, а таксама адмяніць прэзідэнцкі дэкрэт № 12;

- зняць усе адміністрацыйныя, фінансавыя і юрыдычныя абмежаванні свабоды сродкаў масавай інфармацыі, адмяніць цэнзуру ў адпаведнасці з патрабаваннямі артыкула 33 Канстытуцыі і правесці расследаванне выпадкаў нападу і пагрозаў у дачыненні журналістаў;

- зняць разнастайныя адміністрацыйныя, фінансавыя і юрыдычныя абмежаванні правоў асоб і арганізацый, выканаць нормы, замацаваныя ў Дэкларацыі аб праваабаронцах, і правесці расследаванне выпадкаў нападу і пагрозаў у дачыненні праваабаронцаў;

- выканаць рэкамендацыі, падрыхтаваныя Следчай камісіяй Міжнароднай Арганізацыі Працы;

- прыняць меры дзеля забеспячэння роўнасці ўсіх рэлігій у адпаведнасці з Канстытуцыяй;

- забяспечыць выкананне міжнародных норм правядзення дэмакратычных

выбараў і правесці расследаванне па ўсіх заявах аб выбарчых фальсіфікацыях, пададзеных у сувязі з адбыўшыміся ў кастрычніку 2004 года выбарамі і рэферэндумам.

ЗМЕСТ


| | | Пункты |
|---|---|---|
| Уводзіны | | 1 - 3 |
| I. | ДЗЕЯННІ СПЕЦЫЯЛЬНАГА ДАКЛАДЧЫКА | 4 - 14 |
| II. | СТАНОВІШЧА З АСНОЎНЫМІ СВАБОДАМІ І ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА У БЕЛАРУСІ | 15 - 60 |
| A. | Смяротнае пакаранне | 15 - 18 |
| B. | Знікненні людзей | 19 - 21 |
| C. | Катаванні | 22 - 27 |
| D. | Пытанні, датычныя ўтрымання пад вартай | 28 |
| E. | Незалежнасць суддзяў і адвакатаў | 29 - 33 |
| F. | Свабода выказвання меркаванняў | 34 - 42 |
| G. | Свабода сходаў: напады на праваабаронцаў і ўдзельнікаў палітычнай апазіцыі | 43 - 54 |
| H. | Свабода аб’яднанняў | 55 - 56 |
| I. | Свабода сумлення | 57 - 58 |
| J. | Палітычныя правы | 59 - 60 |
| III. | ВЫСНОВЫ І РЭКАМЕНДАЦЫІ | 61 - 102 |

Уводзіны

1. Мандат Спецыяльнага дакладчыка Камісіі па правах чалавека ў Беларусі быў вызначаны Камісіяй у яе рэзалюцыі 2004/14. 12 ліпеня 2004 года Спецыяльным дакладчыкам быў прызначаны Адрыян Севярын.

2. У сваёй рэзалюцыі Камісія прасіла Спецыяльнага дакладчыка наладзіць прамыя кантакты з урадам і народам Беларусі і назіраць за любымі крокамі, скіраванымі на распрацоўку праграмы адукацыі ў галіне правоў чалавека для ўсіх слаёў грамадства, у прыватнасці, для супрацоўнікаў заканадаўчых органаў, судовай сістэмы, пенітэцыярных установаў і грамадзянскай супольнасці і прадставіць справаздачу Камісіі на яе шэсцьдзесят першай сесіі.

3. Дадзеная справаздача грунтуецца на фактах, устаноўленых Спецыяльным дакладчыкам падчас наведвання ім Польшчы, Літвы і Латвіі 30 лістапада - 4 снежня 2004 года, і выніках ягоных дыскусій з markednymi суразмоўцамі ў Бруселі, Вашынгтоне і Нью-Ёрку, праведзеных з 17 па 22 студзеня 2005 года. Яна ўтрымлівае інфармацыю, атрыманую Спецыяльным дакладчыкам да канца лютага 2005 года.

## I. ДЗЕЯННІ СПЕЦЫЯЛЬНАГА ДАКЛАДЧЫКА

4. 21-25 верасня 2004 года Спецыяльны дакладчык удзельнічаў у азнаямляльных гутарках ва Упраўленні Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах чалавека (УВКПЧ). Хаця ён прасіў афіцыйнай сустрэчы з супрацоўнікамі Пастаяннага прадстаўніцтва Беларусі пры штабе Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Жэневе падчас свайго прыезду, але змог сустрэцца з імі толькі ў неафіцыйным парадку. Падчас таго ж візіту ў Жэневу Спецыяльны дакладчык сустрэўся з Выканаўчым дырэктарам Сектара норм і асноўных прынцыпаў і правоў у галіне працы Міжнароднай Арганізацыі Працы Кары Тапіолай, а таксама з супрацоўнікамі пастаянных прадстаўніцтваў Латвіі, Расійскай Федэрацыі і Румыніі. У дадатак, ён сустрэўся з прадстаўнікамі Міжнароднай службы па правах чалавека арганізацыі "Міжнародная амністыя".

5. 23 верасня 2004 года Спецыяльны дакладчык накіраваў ураду Беларусі ліст з просьбай дазволіць яму наведаць краіну, каб сабраць інфармацыю для сваёй справаздачы Камісіі згодна з яе рэзалюцыяй 2004/14. У сваім лісце, а таксама падчас адбыўшыхся ў той жа час у Жэневе неафіцыйных сустрэч з прадстаўнікамі ўрада ён звярнуў увагу на тое, што рэгулярна атрымлівае інфармацыю аб становішчы з правамі чалавека ў Беларусі з розных крыніц, у тым ліку ад грамадзянскай супольнасці і міжнародных арганізацый. Дзеля падрыхтоўкі максімальна збалансаванай справаздачы Спецыяльны дакладчык прасіў даць яму магчымасць таксама наладзіць стасункі і атрымаць інфармацыю непасрэдна ад урада Беларусі. 10 снежня 2004 года ўрад адказаў заявай, нібы рэзалюцыя 2004/14 прадыктавана палітычнымі меркаваннямі, заснавана на прадузятых сцверджаннях, уяўляе сабою відавочны прыклад падыходу, заснаванага на падвойных стандартах, і з'яўляецца насмешкай над прынцыпамі Камісіі. Далей у лісце заяўлялася, што ўрад адмаўляе сцверджанні, на якіх грунтуецца рэзалюцыя, і адвяргае яе саму. Як было сказана ў заключнай частцы ліста, "Рэспубліка Беларусь зноў заяўляе аб рашучым абвяржэнні рэзалюцыі 2004/14, уключаючы змешчаны ў ёй мандат

Спецыяльнага дакладчыка".

6. Спецыяльны дакладчык, з глыбокім жалем прыняўшы да ўвагі адказ урада, вырашыў, што пры адсутнасці істотнага супрацоўніцтва з урадам ён збярэ ўсю магчымую інфармацыю з іншых, няўрадавых крыніц. 30 лістапада - 4 снежня 2004 года ён распачаў фактаўстаноўчую місію ў суседнія краіны - Польшчу, Латвію і Літву; падчас гэтай паездкі ён сустракаўся з прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці, уключаючы праваабарончыя арганізацыі, сродкі масавай інфармацыі, свабодныя прафсаюзы, а таксама з адвакатамі, якія прадстаўлялі інтарэсы асобаў, якія лічаць сябе ахвярамі парушэнняў правоў чалавека, і атрымаў інфармацыю аб становішчы з правамі чалавека ў Беларусі. Акрамя таго, Спецыяльны дакладчык меў таксама магчымасць абмяняцца меркаваннямі аб становішчы ў гэтай галіне з супрацоўнікамі дзяржаўных ведамстваў Польшчы, Латвіі і Літвы. Напрыклад, ён сустракаўся з міністрам замежных спраў Польшчы Ўладзімежам Цімашэвічам, в.а. міністра замежных спраў Літвы Антанасам Валіонісам і з першым намеснікам дзяржаўнага сакратара Латвіі Андрысам Тэйкманісам.

7. Падчас свайго візіту ў Варшаву 30 лістапада Спецыяльны дакладчык таксама сустрэўся з Дырэктарам Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (БДІПЧ АБСЕ) Крысціянам Штрогалам і ягонымі супрацоўнікамі, з прадстаўнікамі Дыпламатычнай акадэміі Міністэрства замежных спраў, з беларускай Асамблеяй няўрадавых дэмакратычных арганізацый, а таксама з такімі арганізацыямі грамадзянскай супольнасці Польшчы, як Хельсінскі фонд правоў чалавека, Фонд Стэфана Баторыя і Усходнееўрапейскі дэмакратычны цэнтр.

8. Падчас візіту ў Рыгу 1 снежня Спецыяльны дакладчык сустрэўся з некалькімі дэпутатамі латвійскага парламента, а таксама з прадстаўнікамі латвійскіх няўрадавых арганізацый (НДА) - латвійскага аддзялення фонда "Адкрытае грамадства", арганізацыі "Адкрытая Беларусь" і латвійскага аддзялення Еўрапейскага руху. Акрамя таго, у Рызе ён сустракаўся з шэрагам вядомых беларускіх юрыстаў і журналістаў, у прыватнасці, з намеснікам старшыні "Беларускай асацыяцыі журналістаў" Андрэем Бастунцом, прадстаўнікамі Праваабарончага цэнтра "Вясна" і моладзевага руху "Зубр".

9. Падчас паездкі ў Вільню 2-4 снежня Спецыяльны дакладчык сустрэўся з сябрамі Камітэта па правах чалавека і Камітэта па замежных справах, сейма, парламента Літвы, а таксама з Каардынатарам-рэзідэнтам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Беларусі і Латвіі і акрамя таго - з дзеячамі шэрагу беларускіх праваабарончых арганізацый, якія прыехалі для гэтага ў Вільню, у тым ліку з прадстаўнікамі Беларускага Хельсінскага камітэта.

10. Па выніках гэтай місіі Спецыяльны дакладчык у перыяд з 17 па 22 студзеня 2005 года меў камандыроўкі ў Брусель, Вашынгтон і Нью-Ёрк. У Бруселі ён сустракаўся з сябрам Еўрапейскай Камісіі па замежных справах і палітыцы добрасуседства Беніта Ферэра-Вальднэрам, а таксама з некаторымі службовымі асобамі Еўрапейскай Камісіі, прадстаўнікамі Старшыні Еўрапейскага Саюза і дэпутатамі Еўрапейскага парламента.

11. У Вашынгтоне Спецыяльны дакладчык абмяркоўваў становішча з правамі чалавека ў Беларусі з Майклам Козакам, в.а. памочніка Дзяржаўнага сакратара, які курыруе Бюро па пытаннях дэмакратыі, правах чалавека і працы, і з шэрагам іншых службовых асоб Дзярждэпартамента. Ён таксама сустрэўся з дзеячамі шэрагу праваабарончых НДА, размешчаных у Вашынгтоне, сябрамі Кангрэса ЗША і дыпламатамі.

12. У Нью-Ёрку Спецыяльны дакладчык сустракаўся з памочнікам Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па палітычных пытаннях Данілам Цюркам, прэзідэнтам інстытута "Адкрытае грамадства" Эраяй Неерам і з некаторымі высокапастаўленымі службовымі асобамі ўстаноў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, навуковымі супрацоўнікамі і экспертамі НДА.

13. 27 студзеня 2005 года Спецыяльны дакладчык удзельнічаў у абмене меркаваннямі з сябрамі падкамітэта па Беларусі Камітэта па палітычных пытаннях Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы ў Страсбурзе (Францыя).

14. Спецыяльны дакладчык меў намер наведаць Расійскую Федэрацыю дзеля кансультацый з усімі дзяржавамі-суседкамі Беларусі і з асноўнымі "дзеючымі асобамі" рэгіянальнага і глабальнага ўзроўню. На ягоны вялікі жаль, гэтая паездка не змагла адбыцца.

## II. СТАНОВІШЧА З АСНОЎНЫМІ СВАБОДАМІ І ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ

### A. Смяротнае пакаранне

15. Паводле інфармацыі Спецыяльнага дакладчыка, Беларусь застаецца апошняй краінай у Еўропе і, апроч Узбекістана, адзінай краінай былога Савецкага Саюза, у якой усё яшчэ прымяняецца смяротнае пакаранне. Паводле атрыманых Адмысловым дакладчыкам звестак, Беларусь з 2001 года штогод прыводзіць у выкананне ад чатырох да сямі смяротных прысудаў, што паказвае пахвальную тэндэнцыю да зніжэння ў параўнанні з папярэднімі гадамі.

16. Хаця забарону смяротнага пакарання ніяк нельга назваць універсальнай з'явай, і міжнароднае права не адносіць само пакаранне да супрацьпраўных дзеянняў, прымяненне апошняга ў Беларусі працягвае выклікаць глыбокую заклапочанасць па прычыне ягонай патэнцыйнай узаемасувязі з іншымі парушэннямі правоў чалавека; гаворка ідзе, напрыклад, аб парушэнні права на справядлівы судовы разгляд, аб катаваннях і бесчалавечным абыходжанні з мэтай атрымаць патрэбныя паказанні. Спецыяльны дакладчык заклапочаны тым, што некаторыя смяротныя прысуды могуць быць неабгрунтаванымі з-за судовых памылак або парушэнняў працэсуальных норм.

17. Акрамя таго, Спецыяльны дакладчык сур'ёзна заклапочаны цяперашнім парадкам прывядзення прысудаў у выкананне і практыкай тайнага пахавання пакараных без інфармавання іх сем'яў, што прычыняе апошнім вялікія пакуты. Такое фактычнае пакаранне родных асуджаных не мае ніякага абгрунтавання ў міжнародна-прававых праваабарончых нормах, у сувязі з чым Спецыяльны дакладчык нагадвае пра наступную выснову, сфармуляваную Спецыяльным дакладчыкам па катаваннях: "Трыманне сем'яў у стане нявызначанасці з мэтай пакараць або запалохаць іх або іншых асобаў, варта лічыць наўмысным і раўназначным жорсткаму і бесчалавечнаму абыходжанню" (E/CN.4/2003/68/Add.2, пункт 65).

18. Спецыяльны дакладчык з задавальненнем адзначае, што ў сакавіку 2004 года Канстытуцыйны суд Беларусі прызнаў некаторыя артыкулы Крымінальнага кодэкса

неадпаведнымі Канстытуцыі, адзначыўшы, што ў цяперашніх умовах кіраўнік дзяржавы і ўрад маглі б заканадаўча адмяніць смяротнае пакаранне або, у якасці першага кроку, увесці мараторый на ягонае прымяненне.

## B. Знікненні людзей

19. Спецыяльны дакладчык занепакоены паведамленнямі аб тым, што расследаванне знікнення ў 1999-2000 гадах чатырох вядомых дзеячоў апазіцыі - былога міністра ўнутраных спраў Юрыя Захаранкі, былога віцэ-старшыні ўраду Віктара Ганчара, прадпрымальніка Анатоля Красоўскага і журналіста Дзмітрыя Завадскага - не было даведзенае да канца.

20. Па наяўнай інфармацыі, вёўшыя следства па гэтай справе службовыя асобы адмовіліся супрацоўнічаць з міжнароднымі органамі і ў 2003 годзе спынілі следства з заявамі, быццам бы знікненні былі "інсцэніраваныя апазіцыяй, каб прыцягнуць увагу міжнароднай грамадскасці". Пазней было адноўленае асобнае следства па справе аб знікненні Дзмітрыя Завадскага, якое скончылася прад'яўленнем абвінавачвання двум былым супрацоўнікам міліцэйскага спецпадраздзялення "Алмаз". У падрыхтаванай у красавіку 2004 года дакладчыкам Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы Хрыстасам Пургурыдэсам справаздачы ўзгадваліся недахопы суда і шэраг працэсуальных недахопаў, уключаючы прызначэнне кіраўніком следчай групы чалавека, якога палітычная апазіцыя падазрае як галоўнага арганізатара знікненняў. У згаданай справаздачы далей гаворыцца аб дачыненні да гэтых знікненняў некаторых высокапастаўленых дзяржаўных службоўцаў, уключаючы кіраўніка дзяржавы. Урад адхіліў высновы, змешчаныя ў гэтай справаздачы, абвясціўшы іх неабгрунтаванымі і палітычна матываванымі.

21. Найбольшую занепакоенасць у Спецыяльнага дакладчыка выклікала непразрыстасць афіцыйнага следчага працэсу па справе аб знікненнях, а таксама ўдзел у ім некалькіх патэнцыйных падазраваных. Ён таксама занепакоены паведамленнямі аб запалохванні, пераследзе і пагрозах рэпрэсій у дачыненні заяўляльнікаў, сведкаў, адвакатаў ды іншых фігурантаў расследавання.

## C. Катаванні

22. Згодна з паведамленнем, атрыманым Спецыяльным дакладчыкам ад суддзі адной высокай інстанцыі, ужыванне катаванняў як сродка атрымання прызнанняў ад затрыманых з'яўляецца звычайнай справай. Гэты суддзя сцвярджае, што ўжываюцца, у прыватнасці, такія катаванні, як падвешванне на вертыкальных металічных кратах і збіццё ў падвешаным стане; пазбаўленне ежы; допыт у начны час; пагрозы катавання і інсцэніроўка пакарання; надзяванне супрацьгаза на затрыманага для абмежавання доступу паветра; вышчыпванне валасоў на лабку; зацісканне наручнікаў да болю.

23. Да Спецыяльнага дакладчыка паступіла інфармацыя аб справе семнаццацігадовага Міхася Аўдзеева, які, як сцвярджаецца, быў жорстка збіты супрацоўнікамі АМАПу Міністэрства ўнутраных справаў падчас публічнай акцыі пратэсту 21 ліпеня 2004 года; яму былі нанесеныя небяспечныя для жыцця траўмы, у тым ліку разрыў селязёнкі, пералом рэбраў і сінякі. На момант падрыхтоўкі дадзенай справаздачы ніякіх паведамленняў аб крымінальным пераследзе адказных за гэтае збіццё асоб не паступіла. Невядома і аб якіх-небудзь выніках па справе Максіма Хромеля, які памёр

у адным з ізалятараў Мінска ад кровазліцця ў мозг, выкліканага жорсткім збіццём яго супрацоўнікамі праваахоўных органаў 23 студзеня 2004 года.

24. Спецыяльны дакладчык заклапочаны паведамленнямі аб сістэматычным катаванні зняволеных, якія чакаюць выканання смяротнага прысуду. У сувязі са справай асуджанага на смерць Зміцера Харкаля, чый прысуд быў перакваліфікаваны на турэмнае зняволенне, паступілі звесткі аб тым, што ў перыяд, калі ён чакаў выканання смяротнага прысуду, яго часта збівалі турэмныя наглядчыкі, якія, наносячы ўдары па галаве, спіне, у жывот і па палавых органах, кожны раз прымушалі яго гаварыць "вялікі дзякуй". Няма дадзеных аб тым, што ўлады пачалі расследаванне па ягоных заявах, і вінаватыя былі пакараныя па законе.

25. Ёсць звесткі, што Міністэрства абароны прызнала сур'ёзнай праблемай ва ўзброеных сілах краіны дзедаўшчыну, жорсткае абыходжанне і фізічныя здзекі з навабранцаў з боку старэйшых ваеннаслужачых дзеля падтрымання строгай дысцыпліны. Спецыяльны дакладчык таксама атрымаў паведамленні, што гэтая практыка не выкараненая, і што адказныя за ўмовы жыцця навабранцаў афіцэры рэдка падвяргаюцца крымінальнаму пераследу.

26. Спецыяльны дакладчык лічыць, што сыходзячы з самога характару гэтага злачынства, а менавіта катаванняў і строгага абмежавання доступу да ахвяраў як у месцах зняволення, чакання выканання смяротных прысудаў, так і на ваенных аб'ектах, тыя рэдкія выпадкі, якія сталі здабыткам галоснасці, уяўляюць сабою толькі вяршыню айсберга. Хаця такое парушэнне правоў чалавека, як катаванні, уласціва не толькі для Беларусі, выразная спецыфіка гэтай з'явы робіць яе асабліва трывожнай. Гаворка ідзе, у прыватнасці, аб адсутнасці надзейнай інфармацыі і аб паведамленнях, што ўлады сістэматрычна прымушаюць суддзяў ігнараваць доказы выкарыстання катаванняў і выносіць судовыя рашэнні, заснаваныя на сведчаннях, здабытых рознымі спосабамі, уключаючы катаванні.

27. Разбуральны ўплыў пастаяннага выкарыстання катаванняў не толькі падрывае фізічнае і псіхічнае здароўе ахвяр ды іхніх сем'яў, але і негатыўна ўплывае на права ахвяраў на справядлівы судовы разгляд. Акрамя таго, памяркоўнае стаўленне да катаванняў з боку афіцыйных органаў падрывае незалежнасць суддзяў і адвакатаў і стварае атмасферу беспакаранасці сярод супрацоўнікаў правапрымяняльных органаў.

D. Пытанні, якія датычаць утрымання пад вартай

28. Спецыяльны дакладчык выказвае сваё задавальненне наведваннем краіны Працоўнай Групай па адвольных затрыманнях 16-26 жніўня 2004 года і ўказвае на выяўленыя ёю праблемы і сфармуляваныя ў справаздачы Групы рэкамендацыі (E/CN.4/2005/6/Add.3). Спецыяльны дакладчык падзяляе выказанае Працоўнай Групай задавальненне духам супрацоўніцтва, які быў праяўлены ўрадам пры арганізацыі місіі Працоўнай Групы ў краіну.

E. Незалежнасць суддзяў і адвакатаў

29. Спецыяльны дакладчык атрымаў вартыя даверу паведамленні ад занепакоеных суддзяў і адвакатаў аб ціску, які аказваецца на іх выканаўчымі органамі

ўлады з мэтай абмежаваць іх незалежнасць або пазбавіць іх яе зусім.

30. Суддзі паведамляюць, што ўмовы службы, а таксама парадак прызначэння, звальнення і дысцыплінарнага ўздзеяння падрываюць незалежнасць суда. Умовы працы ў судах застаюцца неадэкватнымі, а сродкаў на падтрыманне судоў у мінімальным парадку ды абсталяванне тэхнікай не выдзяляецца. Паводле паступіўшай інфармацыі, асноўны заробак суддзяў знаходзіцца ніжэй пражытачнага ўзроўню; у дадатак да яго існуе сістэма значных штомесячных прэмій, якія выплочваюцца па рашэнні старшыняў судоў і Міністэрства юстыцыі. Акрамя таго, у пытаннях доступу да субсідуемага дзяржаўнага жылля суддзі залежаць ад мясцовых органаў кіравання. Усё гэта выклікае сур’ёзную заклапочанасць па прычыне магчымасці аказання на іх эканамічнага ціску.

31. Пасля рэферэндума 1996 года адказнасць за прызначэнне суддзяў высокіх інстанцый перайшла ад парламента да кіраўніка дзяржавы, які цяпер наўпрост прызначае шасцёх з дванаццаці суддзяў Канстытуцыйнага суда і ўсіх суддзяў іншых інстанцый. Кандыдатуры астатніх шасці суддзяў Канстытуцыйнага суда, старшыняў судоў высокіх інстанцый ды іншых службоўцаў судовай сістэмы зацвярджаюцца па рэкамендацыі кіраўніка дзяржавы Нацыянальным Сходам Беларусі, органам, які, як гавораць, кантралюецца ім.

32. Спецыяльны дакладчык выказвае глыбокую заклапочанасць такой з’явай, як “тэлефоннае права”, калі суддзі атрымліваюць па тэлефоне ўказанні аб пажаданым выніку судовага разгляду па справах, якія ўяўляюць цікавасць для ўрада. Спецыяльны дакладчык мае паведамленні аб тым, што некаторыя суддзі, якія быццам бы адмовіліся выконваць такія ўказанні, атрымлівалі дысцыплінарныя спагнанні ці былі звольненыя.

33. Адвакаты паведамляюць аб сур’ёзнай заклапочанасці, якую па-ранейшаму выклікае прэзідэнцкі дэкрэт № 12 1997 года, якім была строга абмежаваная свабода адвакатуры, а Міністэрству юстыцыі былі нададзеныя вельмі шырокія паўнамоцтвы па кантролі адвакатаў. Гэты закон патрабуе, каб ліцэнзіі на адвакацкую дзейнасць аднаўляліся кожныя пяць гадоў, што перашкаджае адвакатам ствараць незалежныя прафесійныя саюзы і абмяжоўвае права на абарону асобаў пры вядзенні крымінальных спраў. На практыцы адвакаты паведамляюць аб частых выпадках умяшальніцтва выканаўчых органаў у іх дзейнасць, аб звальненні вядомых спецыялістаў з рэспубліканскай калегіі адвакатаў і аб пазбаўленні іх ліцэнзій з мэтай звесці да мінімуму іх незалежнасць. У некаторых выпадках урадавыя органы сцвярджалі, што адвакаты звольніліся па ўласным жаданні або былі звольненыя з-за нізкага прафесійнага ўзроўню.

## F. Свабода выказвання меркаванняў

34. Спецыяльны дакладчык атрымаў шматлікія паведамленні аб выпадках парушэння права на выказванне меркаванняў, якія адносяцца, у прыватнасці, да перыяду, які непасрэдна папярэднічаў праведзеным 17 кастрычніка 2004 года выбарам і рэферэндуму. Паводле паступіўшай да яго інфармацыі, за тыя восем месяцаў, якія папярэднічалі выбарам і рэферэндуму, былі прымусова закрытыя 16 зарэгістраваных друкаваных сродкаў масавай інфармацыі. Акрамя таго, паступалі шматлікія скаргі на цяжкасці з выданнем і распаўсюдам незалежных газет на працягу ўсёй перадвыбарчай кампаніі. Спецыяльны дакладчык асабліва занепакоены паведамленнямі аб спробах

увядзення цэнзуры праз установы, якія займаюцца друкам і распаўсюдам выданняў (уключаючы прыватныя фірмы) і якія маюць чыста камерцыйныя адносіны з незалежнымі СМІ, дзейнасць якіх гэтыя ўстановы эфектыўна абмяжоўваюць камерцыйнымі сродкамі. Так, напрыклад, пасля звальнення ў чэрвені 2003 года дырэктара буйнога мінскага выдавецтва "Чырвоная зорка" гэтая ўстанова, як гавораць, спрабуе кантраляваць змест друкуемых газет, выкарыстоўваючы прыёмы, часткова пералічаныя ніжэй. З'ява, якую можна назваць "укараненнем дзяржаўнай цэнзуры" і якая сведчыць аб асаблівай стратэгіі ўладаў, якія імкнуцца далучыць шырокія пласты грамадства да кантролю і абмежавання свабоды выказвання меркаванняў, інфармацыі і перакананняў у Беларусі, з'яўляецца прадметам глыбокай заклапочанасці Спецыяльнага дакладчыка.

35. Паколькі беларускія выдавецтвы адмовіліся друкаваць некаторыя папулярныя незалежныя выданні, апошнія былі вымушаныя заключаць выдавецкія пагадненні з кампаніямі Расійскай Федэрацыі, што ўскладніла працэс распаўсюду выданняў і зрабіла наклады падвергнутымі да перахопу на мытні. 5 жніўня 2004 года рэдакцыя газеты "Народная воля" атрымала ліст ад выдавецтва "Чырвоная зорка" з паведамленнем аб адмове друкаваць газету да таго часу, пакуль судом не будуць знятыя ўсе вылучаныя супраць яе абвінавачванні ў паклёпе і пакуль "Народная воля" не выплаціць у поўным аб'ёме фінансавую кампенсацыю за маральную шкоду дзяржаўным службоўцам, чый іск аб кампенсацыі за паклёп быў задаволены судом у 2003 годзе. Спецыяльнаму дакладчыку далі зразумець, што калі вынесеная рашэннем суда сума не будзе выплачаная цалкам, газета будзе закрытая. Выдавецтва "Светач" анулявала кантракт на выданне яшчэ адной незалежнай газеты пад назвай "Местная газета" па нібыта фінансавых прычынах. Паводле інфармацыі, якая паступіла да Спецыяльнага дакладчыка, гэта адбылося пасля таго, як выдавецтва беспаспяхова спрабавала пераканаць рэдактара газеты зняць артыкул аб карупцыі ў мясцовай падаткавай службе. Паводле паступіўшых паведамленняў, пасля гэтага і іншыя выдавецтвы ў Мінску, Баранавічах і Слоніме адмовіліся друкаваць гэтую газету.

36. Можна прывесці яшчэ адзін выпадак - з сатырычнай газетай "Навінкі", дзейнасць якой, як паведамляецца, неаднаразова прыпынялі з-за адсутнасці паведамлення аб змене юрыдычнага адраса і непрадстаўлення сігнальных асобнікаў Міністэрству інфармацыі. Пасля апошняга прыпынення дзейнасці ў 2004 годзе газета мела цяжкасці з узнаўленнем пагадненняў на друк і пошукам фінансавання. Паступіла таксама паведамленне аб разрыве ў студзені 2004 года кантракта паміж незалежнай газетай "Белорусская деловая газета" і дзвюма дзяржаўнымі сеткамі распаўсюду ("Белпоштай" або Беларускай паштовай службай і дзяржаўнай сеткай распаўсюду друкаваных выданняў "Белсаюздрукам") пасля публікацыі ёю артыкулаў з крытыкай урада. Паведамляецца і аб яшчэ адной форме ціску на сродкі масавай інфармацыі, а менавіта -- аб навязванні выдавецтвамі рэдактарам газет умовы, што крытычныя артыкулы будуць замяняцца фотаздымкамі ці іншымі матэрыяламі.

37. Паводле паведамленняў, ускоснае абмежаванне свабоды сродкаў масавай інфармацыі выяўляецца і ў такой форме, як адміністрацыйны пераслед, напрыклад, у выпадку незалежнага штотыднёвіка "День". 11 траўня 2004 года супрацоўнікі КДБ правяліператрус у рэдакцыі і канфіскавалі абсталяванне па падазрэнні ў дачыненні да публікацыі зневажаючых прэзідэнта ўлётак. Акрамя таго, у красавіку 2004 года міліцыя канфіскавала 4 800 асобнікаў газеты, якія перавозіліся ў Беларусь з выдавецтва ў Смаленску (Расійская Федэрацыя). Лічыцца, што яны былі канфіскаваныя, паколькі

змяшчалі артыкул з крытыкай органаў, якія адмовіліся распачаць пераслед двух чалавек (адзін з якіх нібы з'яўляўся афіцэрам КДБ), арыштаваных 18 сакавіка 2004 года пры спробе пранікнення ў офіс "Бацькаўшчыны" - арганізацыі, якая прадстаўляе офісныя памяшканні штотыднёвіку "День". Паводле паведамленняў, пазней "Бацькаўшчыне" было загадана вызваліць памяшканне за здачу ягонай часткі гэтай газеце. Спецыяльны дакладчык атрымаў інфармацыю аб тым, што дзяржаўныя сеткі супермаркетаў ды іншыя крамы, у тым ліку кнігарні Мінска і іншых частак Беларусі, адмаўляліся прадаваць незалежныя газеты. Як паведамляюць, вядомая кнігарня "Акадэмкніга" быццам бы з-за недахопу месца адмовілася распаўсюджваць выпуск часопіса "Архэ", прысвечаны дзесяцігоддзю кіравання прэзідэнта.

38. Ёсьць паведамленні аб тым, што ў перыяд паміж студзенем і кастрычнікам 2004 года Міністэрствам інфармацыі было арыштавана 12 выпускаў розных беларускіх незалежных газет, сярод якіх "Время", "Згода", "Рабочая салідарнасць", "Вечерний Столин", "Версия", "Неделя", "Региональные новости", "Народный предприниматель", "Молодёжный проспект", "Новая газета Сморгони", "Предпринимательская газета", "Любой каприз" і "Куплю, продам, меняю". Выпуск некаторых з гэтых газет прыпыняўся па такіх прычынах, як змена тэматыкі ("з вытворча-прававой" на "масава-палітычную") і змена перыядычнасці выпуску без апавяшчэння міністэрства. У верасні 2004 года міністэрства распарадзілася прыпыніць на тры месяцы выпуск незалежнага выдання Маладэчна пад назвай "Рэгіянальная газета". Міністэрства паведаміла рэдакцыі, што газета парушыла ўмовы ліцэнзіі на публікацыю, якая прадугледжвала выпуск толькі аднога выдання, у той час як, па меркаванні міністэрства, выдавалася дзве газеты, паколькі міністэрства палічыла ўкладку з тэлевізійнай праграмай асобным перыядычным выданнем.

39. Сярод іншых вядомых абмежаванняў свабоды сродкаў масавай інфармацыі варта адзначыць уведзенае 1 траўня 2004 года патрабаванне аб атрыманні ў Міністэрстве інфармацыі ліцэнзіі на распаўсюд газет па падпісцы і адмова кантралюемых дзяржавай установаў распаўсюджваць незалежныя газеты. Паводле паведамленняў, урадавыя ведамствы не адводзяць эфірны час на перадачы з удзелам асоб і групаў, залічваемых да палітычнай апазіцыі, напрыклад, ансамбляў, якія выступалі на палітычным мітынгу апазіцыі 21 ліпеня 2004 года. Маюцца паведамленні аб тым, што за апошнія два гады рэтрансляцыя замежных (пераважна рускамоўных) праграм па кабельнай сетцы скарацілася на 70%.

40. Распаўсюд замежных друкаваных сродкаў масавай інфармацыі абмежаваны ўведзеным Міністэрствам інфармацыі патрабаваннем аб неабходнасці атрымання ад міністэрства папярэдняга дазволу на распаўсюд кожнай газеты. Па наяўнай інфармацыі, гэтае патрабаванне строга абмежавала паступленне ў краіну шэрагу вядучых замежных газет.

41. Спецыяльны дакладчык асабліва занепакоены паведамленнямі аб выпадках фізічнага нападу на журналістаў і рэдактараў вядомых незалежных сродкаў масавай інфармацыі. 20 кастрычніка 2004 года ў сваёй кватэры ў Мінску была заколатая нажом журналістка незалежнай газеты "Салідарнасць" Вераніка Чаркасава. Яе родныя сцвярджаюць, што перад смерцю ёй паступалі ананімныя пагрозы ў сувязі з журналісцкімі расследаваннямі парушэння спецслужбамі недатыкальнасці прыватнага жыцця. Апошняя серыя яе апублікаваных артыкулаў называлася "КДБ па-ранейшаму

сочыць за вамі”. На момант сваёй смерці яна рыхтавала матэрыялы да артыкулаў аб падаўленні ўрадам свабоды сумлення ў Беларусі. Паводле інфармацыі, якая паступіла да Спецыяльнага дакладчыка на момант прадстаўлення дадзенай справаздачы, міліцыя распрацоўвала толькі адную версію забойства, паводле якой галоўнымі падазраваемымі з'яўляюцца айчым і пятнаццацігадовы сын забітай, хаця яе родныя настойліва ўказвалі следчым на пагрозы расправы, якія паступалі ў адрас Чаркасавай перад расследуемым забойствам. Занепакоенасць выклікае і тая акалічнасць, што яе сын, як паведамляюць, быў дапытаны службай бяспекі ў адсутнасці адвакатаў або паўнагадовых родных, чым былі парушаныя міжнародныя нормы адпраўлення правасуддзя ў дачыненні непаўнагадовых. Спецыяльны дакладчык выказвае сур'ёзную заклапочанасць у сувязі са звесткамі, што сын падвергся ціску з боку ўладаў, якія патрабавалі ад яго прызнацца ў забойстве сваёй маці. Яшчэ адным выпадкам нападу на журналістаў было збіццё і арышт кіраўніка спецыяльных праектаў першага канала расійскага тэлебачання Паўла Шарамета напярэдадні выбараў, праведзеных у кастрычніку 2004 года.

42. Да іншых відаў абмежаванняў, якія накладваюцца на сродкі масавай інфармацыі, Спецыяльны дакладчык залічвае закрыццё офісаў замежных СМІ, адмову ў акрэдытацыі журналістаў або яе пазбаўленне, а таксама дэпартацыю замежных карэспандэнтаў. Спецыяльны дакладчык мае інфармацыю аб тым, што 23 ліпеня 2004 года было закрытае бюро расійскага тэлебачання за “прадузятасць у падачы інфармацыі”. Аб закрыцці бюро было абвешчана пасля таго, як журналіст гэтай тэлекампаніі паведаміў, што ў дэманстрацыі апазіцыі, якая адбылася ў Мінску 21 ліпеня 2004 года, удзельнічала ад 2000 да 5000 чалавек, у то час як па падліках міліцыі ў ёй удзельнічалі толькі 193 чалавекі. Міжнародныя інфармацыйныя агенцтвы назвалі лічбу прыблізна ў 4000 дэманстрантаў. Паведамляецца і аб яшчэ адным выпадку, а менавіта аб дэпартацыі супрацоўнікамі КДБ 21 чэрвеня 2004 года ўкраінскага журналіста Міхаіла Падаляка. Спецыяльнага дакладчыка праінфармавалі аб тым, што М. Падаляк быў схоплены ў кватэры і гвалтоўна пасаджаны на цягнік у накірунку Адэсы. Тым самым ён быў разлучаны са сваёй жонкай, грамадзянкай Беларусі. Згодна з афіцыйнай заявай КДБ, ён абвінавачваецца ў тым, што ў тых артыкулах, дзе ён крытыкуе палітычны і эканамічны курс урада, утрымліваюцца “паклёпніцкія выдумкі” аб палітычнай сітуацыі ў краіне.

## G. Свабода сходаў: напады на праваабаронцаў і дзеячоў палітычнай апазіцыі

43. Спецыяльны дакладчык атрымаў шматлікія паведамленні аб уведзеных дзяржаўнымі органамі абмежаваннях на дзейнасць асобных праваабаронцаў і НДА, у якіх тыя працуюць. Ён занепакоены тым, што большая частка адзначаных ім абмежаванняў відавочна супярэчаць тым міжнародным нормам у галіне правоў чалавека, якія датычаць праваабаронцаў і якія замацаваныя ў міжнародных пактах і дамовах аб правах чалавека і ў Дэкларацыі аб правах і абавязках прыватных асобаў, груп і органаў грамадства заахвочваць і абараняць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды.

44. Да ліку відавочна ідучых уразрэз з такімі нормамі і аб якіх быў праінфармаваны Спецыяльны дакладчык, адносіцца адмова дзяржаўных органаў рэгістраваць праваабарончыя арганізацыі, а таксама выключэнне са спісаў ужо зарэгістраваных арганізацый па надуманых прычынах; залішне строгія абмежаванні на доступ праваабарончых арганізацый да фінансавання з замежных крыніц; абмежаванні на добраахвотнае правядзенне кансультацыйных паслуг і адвакацкай дапамогі

насельніцтву; празмерны кантроль за падаткаабкладаннем і правядзеннем аўдытарскіх праверак, накіраваны перш за ўсё супраць найбольш вядомых праваабарончых арганізацый; празмерныя абмежаванні на свабоду выказвання меркаванняў і перакананняў шляхам уключэння крытыкі кіраўніка дзяржавы ў пералік крымінальна караемых дзеянняў; адмова ў выдачы дазволу на правядзенне публічных дэманстрацый і празмернае ўжыванне сілы пры іх разгоне; а таксама парушэнне права на недатыкальнасць прыватнага жыцця.

45. Уведзеная ў 1999 годзе прававая норма строга рэгулюе рэгістрацыю, функцыянаванне і фінансаванне НДА; гэта дае падставу для заклапочанасці з нагоды залішне груваcткіх працэдур рэгістрацыі, якія даюць уладам шырокія магчымасці для адмовы ў рэгістрацыі і ліквідацыі той або іншай арганізацыі і, па сутнасці, абмяжоўваюць для НДА магчымасць аказання юрыдычнай дапамогі грамадзянам або прадстаўлення інтарэсаў апошніх пры разглядзе грамадзянскіх спраў. Некаторыя з гэтых пытанняў разглядаюцца ў нядаўніх справаздачах Спецыяльнага прадстаўніка па становішчы праваабаронцаў Хіны Джылані (E/CN.4/2004/94/Add.3 і E/CN.4/2003/104/Add.1). У сувязі з гэтым Спецыяльны дакладчык хацеў бы звярнуць увагу на выказаную ёю глыбокую заклапочанасць з нагоды закрыцця ў адміністрацыйным і судовым парадку праваабарончых НДА, вынікам чаго можа стаць стварэнне “празмерна абмежавальных умоваў для дзейнасці праваабаронцаў” (E/CN.4/2004/94/Add.3, пункт 54).

46. Як было паказана Спецыяльным прадстаўніком, найбольшая колькасць адмоваў у рэгістрацыі і выпадкаў пазбаўлення рэгістрацыі НДА назіралася ў 2003 годзе, калі былі закрытыя 51 НДА, у тым ліку -- праваабарончыя; гэтая тэндэнцыя працягвалася і ў 2004 годзе, на працягу якога былі, па наяўных дадзеных, пазбаўленыя рэгістрацыі яшчэ 37 НДА. Большасць, калі не ўсе, з гэтых НДА былі закрытыя за дробныя адміністрацыйныя парушэнні, такія, як адсутнасць зарэгістраванага юрыдычнага адрасу, адхіленні ў дызайне пячаткі або афармленні друкаванага бланка і т.п. За такія адміністрацыйныя парушэнні арганізацыі атрымліваюць папярэджанні ад Міністэрства юстыцыі, два такіх папярэджанні за год даюць дастатковую падставу для ліквідацыі. Сярод арганізацый, якія былі закрытыя або чыя дзейнасць была прыпыненая ў 2004 годзе - Цэнтр рэсурсаў па прававых пытаннях пад назвай “Незалежнае таварыства прававых даследаванняў”, моладзевая арганізацыя “Новая група”, “Беларуская асацыяцыя маладых палітыкаў”, “Беларускі цэнтр канстытуцыяналізму і параўнальных прававых даследаванняў” і “Міжнародны інстытут палітычных даследаванняў”.

47. Спецыяльны дакладчык указвае на асаблівую занепакоенасць Спецыяльнага прадстаўніка “становішчам Беларускага Хельсінкскага камітэта (БХК) - апошняй рэспубліканскай НДА, якой пагражае ліквідацыя”. Гэтаму Камітэту, які застаецца адной з апошніх афіцыйна зарэгістраваных праваабарончых арганізацый, пагражае ліквідацыя па абвінавачванні ва ўхіленні ад выплаты падаткаў. Хаця 23 чэрвеня 2004 года гаспадарчы суд Мінска і касацыйны суд знялі з БХК абвінавачванні ў парушэнні падатковага заканадаўства, Камітэт дзяржаўнага кантролю, як паведамляюць, працягвае крымінальны пераслед - на гэты раз асабіста супраць старшыні БХК Таццяны Процькі і бухгалтара Камітэта Таццяны Руткевіч, абвінавачваючы іх у злачынстве, якое цягне крымінальнае пакаранне тэрмінам да сямі гадоў пазбаўлення волі і канфіскацыю маёмасці. Акрамя таго, 16 верасня 2004 года, пасля таго, як БХК публічна заявіў аб сваіх сумненнях наконт законнасці правядзення рэспубліканскага рэферэндума, прызначанага на 17 кастрычніка 2004 года, Міністэрства юстыцыі, па наяўнай інфармацыі,

распачало працэдуру ліквідацыі гэтай НДА. У кастрычніку 2004 года яшчэ аднаму дзеячу БХК, Гары Паганяйлу, былі прад'яўленыя абвінавачванні ў паклёпе на прэзідэнта за тое, што Паганяйла выказаў заклапочанасць перашкодамі пры расследаванні знікнення вядомых апазіцыйных палітыкаў. Гэта лічыццца злачынствам, якое цягне крымінальнае пакаранне тэрмінам да пяці гадоў пазбаўлення волі. БХК паведамляе, што з верасня 2004 года ягоны вэбсайт, а таксама вэбсайты шэрагу іншых НДА, дзе былі змешчаныя матэрыялы з крытыкай у адрас палітыкі ўрада, былі заблакаваныя.

48. З дакументаў, прадстаўленых Спецыяльнаму дакладчыку, вынікае, што праваабарончыя НДА пазбаўленыя магчымасці аказваць дапамогу грамадзянам, калі тыя не з'яўляюцца сябрамі гэтых НДА і не аплацілі свае сяброўскія ўнёскі. Паведамляецца, што прэзідэнцкім дэкрэтам № 13 ад 15 красавіка 2003 года была ўнесеная папраўка ў артыкул 72 Грамадзянска-працэсуальнага кодэкса, ранейшая рэдакцыя якога дазваляла аб'яднанням грамадзян прадстаўляць інтарэсы абвінавачваемых у судах у адпаведнасці з іх Статутам. Дэкрэт абмяжоўвае гэтае права, прадугледжваючы, што НДА "могуць быць прадстаўнікамі фізічных асоб па грамадзянскіх справах у агульных судах толькі ў выпадку, калі законам ім прадстаўленае права прадстаўляць і абараняць у судзе правы і законныя інтарэсы сяброў гэтых грамадскіх аб'яднанняў (арганізацый) ды іншых асоб". Ёсць інфармацыя, што за час пасля ўступленя ў сілу гэтага дэкрэта ў 2003 годзе дадзенае становішча было скарыстанае для ліквідацыі шэрагу аб'яднанняў, што, па сутнасці, паклала канец дзейнасці шэрагу бясплатных юрыдычных кансультацый ды іншых арганізацый па аказанні прававой дапамогі.

49. Ёсць звесткі, што доступ да фінансавання з замежных крыніц строга абмежаваны. Усе замежныя гранты падлягаюць зацвярджэнню дзяржаўнымі органамі паводле дэкрэта прэзідэнта № 24 ад 28 лістапада 2003 года, які забараняе НДА выкарыстоўваць такую дапамогу для арганізацыі "мітынгаў, дэманстрацый, пікетаванняў", а таксама "вырабу і распаўсюджання агітацыйных матэрыялаў ды іншых форм палітычнай працы". На практыцы ж гэты ўказ выкарыстоўваецца для пільнага кантролю замежнай фінансавай дапамогі НДА; ён таксама забараняе паступленне сродкаў з-за мяжы на адукацыйныя праекты і любую дзейнасць, якую ўрад палічыць "палітычнай". Прызнаныя парушаючымі гэты дэкрэт НДА або палітычныя партыі здымаюцца з рэгістрацыі. Як стала вядома, некалькі НДА ужо былі ліквідаваныя за парушэнне правілаў замежнага фінансавання.

50. Дзеячы НДА выказалі Спецыяльнаму дакладчыку сваю заклапочанасць тым, што часта пасля ліквідацыі НДА пачынаецца пераслед вядомых дзеячоў ужо ў індывідуальным парадку, што мела месца, напрыклад, у выпадку спадарынь Процькі і Руткевіч з БХК. Іншыя дзеячы сутыкаюцца з нарастаючым ціскам па месцы працы або вучобы; былі выпадкі, калі асобы адлічваліся з навучальных установаў або звальняліся з працы на дзяржаўных прадпрыемствах у сувязі з праваабарончай дзейнасцю. Лічыцца, што ўведзеная ў 2004 годзе на ўсіх дзяржаўных прадпрыемствах абавязковая сістэма найму па кароткатэрміновых кантрактах (часцей за ўсё на тэрмін да аднога года) стварае ўмовы для запалохвання і пераследу праваабаронцаў і палітычных дзеячоў у дагэтуль нябачаных маштабах.

51. Паводле інфармацыі, якая паступіла да Спецыяльнага дакладчыка, пасля адбыўшыхся 17 кастрычніка 2004 года рэферэндума і парламенцкіх выбараў некаторыя з удзельнікаў дэманстрацыі 19 кастрычніка 2004 года, якія мірна пратэставалі супраць вынікаў гэтых мерапрыемстваў, былі арыштаваныя і збітыя міліцыяй, стаўшы

ахвярамі самаўпраўства ўладаў. Маюцца звесткі аб тым, што міліцыянты, навучаныя падаўленню масавых беспарадкаў, скарысталі дубінкі, каб рассеяць натоўп з сотняў дэманстрантаў, у тым ліку маладых актывістаў і вядучых дзеячоў апазіцыі, якія рухаліся ў напрамку прэзідэнцкага палаца. Вядома, што старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька быў шпіталізаваны з-за нанесеных яму траўмаў, а старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) Мікалай Статкевіч і былы старшыня "Маладога фронту" Павел Севярынец былі арыштаваныя і ўзятыя пад варту. Паведамляецца, што журналісты расійскіх тэлеканалаў "REN-TV" і "НТВ" былі збітыя, а журналіст АФП быў затрыманы. Прыкладна чатыром дзесяткам чалавек былі прад'яўленыя абвінавачванні ва ўдзеле ў несанкцыянаванай масавай дэманстрацыі або яе арганізацыі на падставе Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях; гэтыя асобы былі пакараныя пазбаўленнем волі на тэрмін да 15 сутак або штрафамі.

52. Спецыяльны дакладчык указвае на паведамленні, што насуперак спробам, распачатым групамі палітычных дзеячоў, з 1999 года не было зарэгістравана ніводнай палітычнай партыі. У жніўні 2004 года рашэннем Вярхоўнага суда была ліквідаваная Беларуская партыя працы, і тады ж яшчэ чатыры ўплывовыя апазіцыйныя партыі - Партыя камуністаў Беларуская, Партыя БНФ, Аб'яднаная грамадзянская партыя і Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада) - атрымалі афіцыйныя папярэджанні ад Міністэрства юстыцыі. Ёсць інфармацыя, што міністэрства пагражала ліквідаваць гэтыя партыі, калі яны не спыняць заяваў ад імя палітычнага апазіцыйнага аб'яднання пад назвай "Народная кааліцыя 5+" напярэдадні парламенцкіх выбараў і рэферэндума.

53. У перыяд паміж красавіком і канцом снежня 2004 года знаходзіўся пад вартай былы міністр знешнеэканамічных сувязяў Міхаіл Марыніч, які пазней быў асуджаны да пяці гадоў турмы па абвінавачанні ў крадзяжы кампутарнай тэхнікі, арандаванай НДА "Дзелавая ініцыятыва" ў амбасады ЗША у Мінску; і НДА, і амбасада адмаўлялі прад'яўленае яму абвінавачванне. Падчас наведвання Беларусі Працоўнай Групай па адвольных затрыманнях у жніўні 2004 года яе сябрам было адмоўлена ў сустрэчы са спадаром Марынічам. Як адзначаюць назіральнікі, шматлікія пытанні, зададзеныя сп. Марынічу падчас судовага разгляду, датычылі ягонай палітычнай дзейнасці, а не вылучаных супраць яго абвінавачванняў, з прычыны чаго Спецыяльны дакладчык выяўляе занепакоенасць тым, ці не з'яўляецца працяглае ўтрыманне сп. Марыніча пад вартай і яго наступнае асуджэнне палітычна матываванымі дзеяннямі.

54. 7 верасня 2004 года суд цэнтральнага раёна г. Мінска асудзіў сябра беларускага моладзевага аб'яднання "Малады фронт" Зміцера Дашкевіча да 10 сутак арышту за выкрыкі "Ганьба!" на цэнтральнай плошчы горада пасля звароту прэзідэнта да народа з нагоды правядзення рэферэндума 17 кастрычніка.

## Н. Свабода аб'яднанняў

55. Спецыяльны дакладчык жадаў бы звярнуць увагу на ўсеабдымную справаздачу Камісіі па расследаванні МАП, якая правяла расследаванне па заявах аб парушэнні правоў працоўных у перыяд з лістапада 2003 па кастрычнік 2004 года. Камісія па расследаванні ўстанавіла, што некалькім незалежным прафсаюзам было адмоўлена ў праве на калектыўную дамову шляхам адмовы ў рэгістрацыі новых прафсаюзаў і пазбаўлення рэгістрацыі ўжо існуючых. Камісія па расследаванні ўстанавіла, што арганізацыі

працоўных былі пазбаўленыя магчымасці свабодна арганізоўваць сваю дзейнасць і што законы, якія рэгламентуюць рэгістрацыю прафсаюзаў, прымяняліся для перашкод у стварэнні і функцыянаванні прафсаюзаў. Камітэт па стандартах МАП настойліва заклікаў урад спыніць умяшальніцтва ў справы прафсаюзаў і цалкам выканаць рэкамендацыі МАП.

56. Да ведама Спецыяльнага дакладчыка была таксама даведзеная інфармацыя, што працоўныя дзяржаўных прадпрыемстваў, якія ўступаюць у незалежныя прафсаюзы, часта падвяргаюцца пагрозам і запалохванню аж да звальнення. Паведамляецца, што пераход на сістэму кароткатэрміновых кантрактаў, які быў праведзены ў 2004 годзе, выкарыстоўваецца для ўціску ўдзельнікаў незалежных прафсаюзаў ды іншых палітычна актыўных працоўных.

I. Свабода сумлення

57. Спецыяльны дакладчык адзначае, што свабода сумлення і прынцып роўнасці рэлігій абвешчаныя ў Канстытуцыі Беларусі. У сувязі з гэтым ён занепакоены існаваннем спецыяльнага парадку, калі аднаму рэлігійнаму аб'яднанню прадстаўляюцца правы, недаступныя іншым. Дамова, падпісаная ў чэрвені 2003 года паміж дзяржавай і Беларускай праваслаўнай царквой, якая з'яўляецца экзархатам Рускай праваслаўнай царквы, надзяляе БПЦ выключным правам афіцыйнага выкарыстання слова "праваслаўная", тады як у краіне маецца яшчэ па меншай меры два аб'яднанні, якія маюць гэтае слова ў сваёй назве. Па гэтай прычыне дадзеныя аб'яднанні, адным з якіх з'яўляецца Беларуская аўтакефальная праваслаўная царква, не могуць дамагчыся афіцыйнай рэгістрацыі і, адпаведна, не маюць магчымасці на законных падставах адпраўляць культ на калектыўнай аснове. Беларуская праваслаўная царква, паводле закона, адыгрывае "вызначальную ролю" ў духоўным, культурным і дзяржаўным жыцці Беларусі. Некаторыя іншыя рэлігіі, напрыклад, каталіцызм, лютэранства, іудаізм і іслам, прызнаюцца "традыцыйнымі"; што ж датычыць новых рэлігійных аб'яднанняў, такіх, як царква Свядомасці Крышны, - яны лічацца "нетрадыцыйнымі" і не могуць дабіцца рэгістрацыі, што робіць іх безабароннымі перад адміністрацыйным пераследам.

58. Паводле наяўнай інфармацыі, прыватная рэлігійная практыка ў выглядзе, напрыклад, груп вывучэння Бібліі на даму або "хатніх цэркваў", забароненая. Дзейнічае абмежавальная сістэма дазволаў на правядзенне рэлігійных абрадаў суполкамі, якія не маюць уласных памяшканняў, а правядзенне рэлігійных сходаў або спеў рэлігійных гімнаў у грамадскіх месцах забароненыя. Так, у красавіку 2004 года за групавы спеў гімнаў і распаўсюджванне Бібліі сярод пацыентаў і наведвальнікаў мозельскай бальніцы былі арыштаваныя і аштрафаваныя тры баптысты, якія загадзя праінфармавалі адміністрацыю бальніцы аб сваім наведванні. Тыя суполкі, якія спрабуюць набыць нерухомасць для адпраўлення рэлігійных культаў (напрыклад, таварыства Свядомасці Крышны і некаторыя пратэстанцкія цэрквы), сутыкаюцца з непераадольнымі адміністрацыйнымі перашкодамі як на ўзроўні цэнтральнага ўрада, так і на мясцовым узроўні. Спецыяльны дакладчык таксама занепакоены паведамленнямі аб цэнзуры рэлігійнай літаратуры і бяздзейнасцю ўладаў у дачыненні да органаў масавай інфармацыі, якія распаўсюджваюць панікёрскую або недакладную інфармацыю аб другарадных рэлігійных групах, тым самым распальваючы варожасць і нянавісць сярод насельніцтва.

## J. Палітычныя правы

59. 17 кастрычніка 2004 года адбыліся парламенцкія выбары і рэферэндум аб пераглядзе Канстытуцыі дзеля адмены ў ёй абмежавання колькасці прэзідэнцкіх тэрмінаў для адной асобы. У выніку ў новым парламенце няма ніводнага прадстаўніка палітычнай апазіцыі, а цяперашні кіраўнік дзяржавы мае права балатавацца ў 2006 годзе на трэці тэрмін. Місія АБСЕ па назіранні за выбарамі прыйшла да высновы, што гэтыя выбары далёка не адпавядалі міжнародным нормам, і звярнула ўвагу на дапушчаныя парушэнні, сярод якіх былі: адмова рэгістраваць кандыдатаў ад апазіцыі, затрыманне агітатараў і назіральнікаў ад апазіцыі, незбалансаванасць у асвятленні выбарчага працэса сродкамі масавай інфармацыі, сур'ёзныя недахопы пры падліку галасоў і падвядзенні вынікаў галасавання і абмежавальныя правілы вядзення перадвыбарчай кампаніі.

60. У паведамленнях, атрыманых Спецыяльным дакладчыкам, ёсць скаргі на ўкідванне выбарчых бюлетэняў і прымус незалежных кандыдатаў да зняцця сваіх кандыдатур, у тым ліку шляхам пагрозаў звальнення з боку наймальнікаў.
Спецыяльнаму дакладчыку былі прадстаўленыя выкарыстаныя падчас рэферэндума выбарчыя бюлетэні з адзнакай "супраць", якія, як сцвярджалася, былі знойдзеныя назіральнікамі за выбарамі ў смеццевых кантэйнерах у Барысаве на наступны дзень пасля выбараў. У выбарчых жа дакументах значылася, што ўсе выбарчыя бюлетэні па гэтым участку былі падлічаныя. Паводле паступіўшай інфармацыі, скарга з патрабаваннем расследавання гэтага інцыдэнта была адхіленая судом, а пракуратура дагэтуль не правяла расследавання абставін, звязаных з гэтай знаходкай.

# III. ВЫСНОВЫ І РЭКАМЕНДАЦЫІ

61. Кіруючыся сабранай інфармацыяй, Спецыяльны дакладчык прыйшоў да высновы, што беларускае грамадства па сваім характары з'яўляецца закрытым і падкантрольным. Спецыяльны дакладчык лічыць, што, хаця ў Беларусі яшчэ не ўсталявалася сапраўдная дыктатура, але краіна наблізілася да яе ўшчыльную. Існуючы рэжым па сваёй прыродзе з'яўляецца аўтарытарным. Кіраўнік дзяржавы сцвярджае, што ягоная законнасць заснаваная непасрэдна на сувязі з народам, і таму не прызнае любых канстытуцыйных, прававых або істытуцыянальных абмежаванняў. У такой сістэме практычна няма месца для правоў чалавека.

62. Беларусь - бюракратычная дзяржава. У ёй няма сапраўды моцнай грамадзянскай супольнасці, як і сфармаванага сярэдняга класа. Замест гэтага існуе вертыкальная іерархія дзяржаўных службоўцаў, якія распараджаюцца бюджэтам краіны ў адпаведнасці з устаноўленымі прэзідэнтам прыярытэтамі. Самавольна распараджаючыся бюджэтам, прэзідэнт можа прапагандаваць уласныя палітычныя ідэі, выступаючы абаронцам тых, каго лічыць патрэбным. Пакора астатняй часткі насельніцтва забяспечваецца сродкамі падаўлення. З гэтай прычыны беларускае грамадства з'яўляецца адначасова моцна прымушаемым і расколатым.

63. Акрамя таго, Беларусь сутыкаецца з сур'ёзнай праблемай самабытнасці, якая дасюль пад пытаннем. Такая нявызначанасць не дазваляе беларускай нацыі ні дасягнуць поўнай разняволенасці на міжнародным узроўні, ні арганізаваць абарону дэмакратыі ўнутры краіны. Разумеючы, што народ без выразнай нацыянальнай самасвядомасці

можна лёгка кантраляваць як знутры краіны, так і звонку, прэзідэнт праводзіць палітыку ўзвядзення ўсё больш сур'ёзных перашкод для развіцця беларускай мовы, традыцый і культуры.

64. Такім чынам, невыкананне правоў чалавека ў Беларусі пачынаецца з адмаўлення права на культурную (нацыянальную) самабытнасць. Парадокс у тым, што прэзідэнт, які лічыць сябе бацькам нацыі, пастаянна стрымлівае рост нацыянальнай самасвядомасці. У любой дзяржаве няздольнасць абаперціся на ўласныя сілы можа падвышаць магчымасці для ўздзеяння знешніх фактараў, аднак беларускае кіраўніцтва, відаць, ахвотна ідзе на гэта ў той ступені, у якой такі стан рэчаў адначасова тармозіць палітычную актыўнасць народа.

65. Прымаючы ўсё гэта да ўвагі, становіцца цалкам зразумела, што забеспячэнне глыбейшай павагі да правоў чалавека ў Беларусі залежыць не толькі ад лініі паводзінаў і палітычных схільнасцяў кіраўніка дзяржавы, але і ад характару і асаблівасцяў палітычнага рэжыму і арганізацыі беларускага грамадства ў цэлым. Для заахвочвання правоў чалавека ў краіне патрабуецца дасканалая рэформа палітычнай сістэмы і карэнная перабудова грамадства.

66. У залежнасці ад таго, як развіваюцца міжнародныя падзеі, геапалітычны кантэкст можа аказваць як пазітыўны, так і негатыўны ўплыў на пажаданыя пераўтварэнні. На дадзены момант Спецыяльны дакладчык мяркуе, што міжнародныя спрэчкі вакол Беларусі і датычныя яе міжнародныя амбіцыі не спрыяюць заахвочванню правоў чалавека ў гэтай краіне. Захаванне статус-кво ў пытанні правоў чалавека ў Беларусі ўспрымаецца шматлікімі міжнароднымі дзеячамі як спосаб захавання статус-кво і ў геапалітычных пытаннях. Пакуль Беларусь разглядаецца ў якасці пешкі ў буйнейшай геапалітычнай гульні, у міжнароднай супольнасці не будзе адзінства па пытанні аб правах чалавека ў Беларусі. Каб змяніць да лепшага цяперашняе становішча з правамі чалавека ў гэтай краіне, неабходнае выступленне міжнароднай супольнасці адзіным фронтам.

67. У святле вышэйпададзенага пастаяннае пагаршэнне становішча з правамі чалавека ў Беларусі стала праблемай, якая выклікае заклапочанасць міжнароднай супольнасці не толькі па гуманітарных меркаваннях, але і па меркаваннях бяспекі.

68. Па меркаванні Спецыяльнага дакладчыка, надзвычай важна распрацаваць надзейную праграму інфармацыйна-папулярызацыйнай працы з насельніцтвам па пытаннях правоў чалавека ў інтарэсах простых грамадзян Беларусі. На жаль, такая праграма не можа быць рэалізаваная ў краіне, дзе існуюць строгія абмежаванні грамадзянскіх ініцыятываў, а сродкі масавай інфармацыі знаходзяцца пад пільным кантролем урада. Таму Камісіі па правах чалавека ва ўзаемадзеянні з іншымі міжнароднымі арганізацыямі, такімі, як АБСЕ і ЕС, варта стварыць дзеля асветніцкай працы па правах чалавека ў Беларусі міжнародны фонд, які б функцыянаваў пад наглядам Камісіі.

69. Такі фонд варта выкарыстаць перш за ўсё для стварэння і фінансавання ў суседняй з Беларуссю краіне тэлерадыёстанцыі (уключаючы неабходныя сродкі спадарожнікавага вяшчання), закліканай даваць насельніцтву Беларусі дакладную, поўную і нецэнзураваную інфармацыю. Гэтыя медыяканалы таксама маглі б

выкарыстоўвацца для асвятлення і відавочнай дэманстрацыі парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі і іншых краінах, а таксама для інфармавання аб магчымых шляхах барацьбы з такімі парушэннямі ў адпаведнасці з дэмакратычнымі нормамі і міжнароднай практыкай. У той жа час яны павінны быць пэўным унёскам ва ўмацаванне культурнай самасвядомасці і нацыянальнай самабытнасці беларускага народа.

70. Камісіі, сумесна з гатовымі да гэтага зацікаўленымі міжнароднымі і нацыянальнымі ўрадавымі і няўрадавымі арганізацыямі, а таксама з прыватнымі донарамі, варта распрацаваць і рэалізаваць усеабдымную праграму падрыхтоўкі кадраў для грамадзянскай супольнасці. Такая праграма павінна быць арыентаваная перш за ўсё на стварэнне ў Беларусі, галоўным чынам на мясцовым узроўні, непалітычных НДА, падрыхтоўку кадраў для іх і садзейнічанне развіццю грамадзянскай супольнасці ды яднанне беларускіх грамадзян на нізавым узроўні.

71. У той жа час, міжнародная супольнасць павінна і надалей імкнуцца перадаць беларускім НДА і дэмакратычным палітычным партыям краіны неабходнае “ноў-хаў”, а таксама аказваць ім тэхнічную дапамогу і падтрымку (маральную, палітычную, фінансавую, інтэлектуальную і матэрыяльна-тэхнічную). Патрабуецца таксама і прававая дапамога ў абароне прыхільнікаў дэмакратыі, сяброў грамадскіх аб’яднанняў і палітычных партый, а таксама іх родных ад неправамоцных дзеянняў дзяржаўных органаў.

72. Камісія павінна ініцыяваць стварэнне стала дзеючага “круглага стала” па правах чалавека ў Беларусі і садзейнічаць ягонай працы ў адпаведнасці з наяўнымі патрэбамі. Гэты “круглы стол” павінен быць пераважна беларускім па складзе, працаваць пад эгідай Камісіі і мець прыхільнае стаўленне з яе боку. “Круглы стол” павінен стаць форумам для дыялогу прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, палітычных партый і ўрадавых структур Беларусі. Мэты дыялогу - ацэньваць поспехі ў развіцці правоў чалавека ў Беларусі, а таксама вызначаць шляхам перамоваў палітычныя, адміністрацыйныя і заканадаўчыя меры па пераадоленні наступстваў парушэння гэтых правоў. Калі беларускія ўлады не гатовыя падтрымаць такую ідэю, то “круглы стол” павінен пачаць сваю працу нават у іх адсутнасць, выступаючы ў ролі грамадзянскага форума, які дае ясныя ацэнкі і распрацоўвае палітычныя і заканадаўчыя ініцыятывы, якія маглі б стаць карыснымі для ўрада і грамадства. Калі беларускія ўлады не пагодзяцца з функцыянаваннем “круглага стала” на беларускай тэрыторыі, яго варта стварыць у суседняй краіне са згоды яе ўладаў і пры падтрымцы Камісіі.

73. Па просьбе Камісіі Вярхоўнаму камісару па правах чалавека варта склікаць міжнародную канферэнцыю, прысвечаную становішчу з правамі чалавека ў Беларусі, запрасіўшы на яе ўсе дзяржавы, якія занепакоены пагаршэннем становішча ў Беларусі, мяркуючыя, што такое пагаршэнне стварае пагрозу для рэгіянальнай бяспекі і стабільнасці, і гатовыя рэальна садзейнічаць паляпшэнню становішча з правамі чалавека ў краіне. Адпаведна, міжнародная супольнасць павінна паспрабаваць дасягнуць адзінага падыходу да становішча з правамі чалавека ў Беларусі і адначасова распрацаваць комплекс дакладных і ўсебаковых палітычных мер з мэтай дамагчыся ад усіх зацікаўленых бакоў належнай павагі да правоў грамадзян Беларусі.

74. Камісіі варта звярнуцца да Вярхоўнага камісара па правах чалавека з заклікам ініцыяваць заснаванне міжнароднай групы па правах чалавека ў Беларусі. Пад

эгідай гэтай групы варта было б сфармаваць дзве іншыя групы - кантактную групу па становішчы з правамі чалавека ў Беларусі, якая складалася б з невялікай колькасці прадстаўнікоў урадаў розных дзяржаў, якія паспрабуюць наладзіць канструктыўны дыялог з беларускімі ўладамі па гэтым пытанні, і групы донараў, якія паспрабуюць мабілізаваць сродкі, неабходныя для падтрымкі розных праграм ды ініцыятываў, якія маюць на мэце дамагчыся глыбейшай павагі да правоў чалавека ў Беларусі. Такія сродкі варта выкарыстаць на культурныя праграмы, накіраваныя на развіццё нацыянальнай самабытнасці беларускага народа.

75. Варта заахвочваць ЕС ды іншыя буйныя еўрапейскія арганізацыі да правядзення стымулюючай і натхняючай палітыкі ў дачыненні Беларусі, ставячы адной з асноўных мэтаў падтрымку правоў чалавека ў гэтай краіне. Такая ініцыятыўная і гнуткая стратэгія павінна прадугледжваць, з аднога боку, адпаведныя санкцыі, а з іншага - належныя стымулы з мэтай заахвоціць беларускія ўлады да канструктыўнага дыялогу (уключаючы дыялог з беларускай грамадзянскай супольнасцю) і да прагматычных дзеянняў, накіраваных на паляпшэнне становішча ў краіне ў сферы развіцця дэмакратыі і правоў чалавека.

76. Па меркаванні Спецыяльнага дакладчыка, міжнародная ізаляцыя Беларусі непажаданая для яе народа, развіцця правоў чалавека ў гэтай краіне або яе будучай інтэграцыі ў структуры дэмакратычнага свету. Разам з тым, Спецыяльны дакладчык лічыць, што на дадзены момант ад уведзеных міжнароднай супольнасцю санкцый у дачыненні Беларусі адмаўляцца нельга; іх варта адмяняць паступова, замяняючы пазітыўнымі мерамі толькі па меры паляпшэння становішча ў Беларусі з правамі чалавека. У сувязі з гэтым вельмі мэтазгодна распрацаваць выразную “стратэгію арыенціраў”, якая дазваляла б міжнароднай супольнасці аператыўна карэктаваць сваю палітыку ў залежнасці ад дасягнутых у краіне поспехаў і ў той жа час давала б беларускім уладам дакладнае ўяўленне аб наступствах іх дзеянняў.

77. У якасці сваёй галоўнай мэты міжнародная супольнасць (як арганізацыі, так і донары) павінна ставіць павышэнне эфектыўнасці сваёй палітыкі, закліканай забяспечыць павагу да правоў чалавека ў Беларусі за кошт паглыблення сінэргетычнага ўзаемадзеяння і адзінства. Ключавая роля належыць Расійскай Федэрацыі як краіне-суседцы, якая мае асаблівыя палітычныя адносіны з Беларуссю. Правы чалавека не павінны стаць закладнікам геапалітычных супярэчнасцяў і суперніцтва.

78. У той жа час, унутры самога беларускага грамадства патрэбнае адзінства дзеянняў у інтарэсах павагі да правоў чалавека. Розным зацікаўленым колам беларускага грамадства варта адмовіцца ад спрэчак па неістотных пытаннях, асабістых амбіцый і недальнабачных дзеянняў дзеля сур’ёзных сумесных высілкаў. Для гэтага міжнароднай супольнасці варта падтрымліваць толькі або хаця б тыя праекты, якія сумесна вылучаюцца дэмакратычнымі палітычнымі і/або грамадскімі сіламі Беларусі.

79. Спецыяльны дакладчык падзяляе агульную адсутнасць аптымізму наконт гатоўнасці цяперашняга ўрада Беларусі радыкальна палепшыць становішча ў галіне правоў чалавека ў краіне. Разам з тым, ён лічыць, што ва ўрадавых колах Беларусі ёсць шэраг асоб, якія разумеюць, што заснаваная на закрытым і кантралюемым грамадстве сістэма не мае перспектыў у глабалізаваным дэмакратычным свеце ва ўмовах міжнароднай ізаляцыі. Таму яны больш адкрытыя для дыялогу і пазітыўных пераменаў.

Мае сэнс паспрабаваць захаваць сувязь з такімі людзьмі.

80. Акрамя таго, мэтазгодна, каб міжнародная супольнасць працягнула свае дзеянні па заахвочванні беларускіх уладаў (уключаючы тых, хто да цяперашняга часу адмаўляўся ад дыялогу) да больш актыўнага супрацоўніцтва, накіраванага на паляпшэнне становішча з правамі чалавека ў краіне. У сувязі з гэтым міжнародная супольнасць ужо выразна пазначыла свае арыенціры і спадзяванні. Яна таксама ўказала, у якіх сферах трэба праводзіць рэформы. Гэта датычыць грамадзянскіх і палітычных правоў, такіх, як права на жыццё, свабода сходаў, свабода аб'яднанняў, свабода сумлення, права голасу і свабоднага выбару; эканамічных і сацыяльных правоў, якія датычаць, напрыклад, занятасці, адукацыі, аховы здароўя і г.д.; а таксама культурных правоў, уключаючы акадэмічныя свабоды, правы меншасцяў і г.д. Улічваючы вышэйсказанае і прызнаючы раўназначнасць усіх правоў чалавека, Спецыяльны дакладчык мяркуе, што ў дадзеных умовах найбольш неабходны поспех у пытанні аб свабодзе сродкаў масавай інфармацыі і незалежнасці судовай сістэмы.

81. Кіруючыся сваімі высновамі, Спецыяльны дакладчык фармулюе для ўраду Беларусі наступныя рэкамендацыі:

Рэкамендацыі адносна смяротнага пакарання

82. Спецыяльны дакладчык рэкамендуе ўраду неадкладна правесці аналіз цяперашняй практыкі прывядзення смяротных прысудаў у выкананне з тым, каб зняць завесу сакрэтнасці з датаў выканання прысудаў і неадкладна перадаць целы ўсіх пакараных зняволеных іх сем'ям.

83. Улічваючы тое, што пакаранне ў выглядзе смяротнага пакарання па сваёй прыродзе з'яўляецца незваротным і вынясенне смяротнага прысуду спалучанае з магчымасцю судовай памылкі, Спецыяльны дакладчык рэкамендуе перагледзець усе смяротныя прысуды, вынесеныя зняволеным, якія чакаюць прывядзення іх у выкананне, замяніўшы іх адпаведным тэрмінам зняволення.

84. Акрамя таго, Спецыяльны дакладчык заклікае ўрад разгледзець пытанне аб ратыфікацыі другога Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, прысвечанага адмене смяротнага пакарання, і ўключыць ягоныя палажэнні ў нормы ўнутранага права.

85. Спецыяльны дакладчык вітае рэкамендацыю Канстытуцыйнага суда аб адмене смяротнага пакарання або ўвядзенні ў якасці першага кроку мараторыя на яго і, як і Суд, настойліва заклікае кіраўніка дзяржавы і парламент неадкладна ажыццявіць такую меру.

86. Спецыяльны дакладчык рэкамендуе ўсім іншым урадам - да таго моманту, пакуль не будуць вырашаныя праблемы адносна выкарыстання смяротных прысудаў у Беларусі - не дапускаць дэпартацыі або экстрадыцыі любой асобы, калі ў выніку такой дэпартацыі або экстрадыцыі яна апынецца пад пагрозай сур'ёзнага парушэння яе чалавечых правоў, уключаючы смяротнае пакаранне і катаванні.

Рэкамендацыі адносна знікненняў палітычных дзеячоў

87. Спецыяльны дакладчык заклікае ўрад аднавіць расследаванне знікнення спадароў Захаранкі, Ганчара, Красоўскага і Завадскага, звярнуўшыся па дапамогу да кваліфікаваных і бесстаронніх міжнародных крыміналістаў дзеля правядзення незалежнага і празрыстага расследавання, выяўлення і пакарання вінаватых у гэтых дзеяннях, а таксама інфармавання сем'яў пра лёс зніклых сваякоў.

88. Акрамя таго, Спецыяльны дакладчык заклікае неадкладна выплаціць справядлівую кампенсацыю сем'ям зніклых палітыкаў.

Рэкамендацыі адносна катаванняў, бесчалавечнага абыходжання, а таксама жорсткага і зневажаючага пакарання

89. Спецыяльны дакладчык заклікае ўрад накіраваць запрашэнне Спецыяльнаму дакладчыку па пытанні аб катаваннях хаця б для азнаямленчага візіту ў краіну і скарыстацца гэтай магчымасцю для правядзення з ім кансультацый аб магчымых кроках барацьбы з беспакаранасцю супрацоўнікаў правапрымяняльных органаў і выкаранення практыкі катаванняў.

90. Спецыяльны дакладчык заклікае ўрад стварыць (калі неабходна, ва ўзаемадзеянні з кваліфікаванымі экспертамі грамадзянскай супольнасці) сетку цэнтраў па рэабілітацыі ахвяраў катаванняў, у якіх такім ахвярам прапаноўвалася б прававая, псіхалагічная і спецыялізаваная медыцынская дапамога.

Рэкамендацыя адносна ўтрымання пад вартай

91. Спецыяльны дакладчык настойліва заклікае ўрад цалкам выканаць рэкамендацыі, сфармуляваныя Працоўнай Групай па адвольных затрыманнях у выніку яе візіту ў краіну ў жніўні 2004 года.

Рэкамендацыя адносна незалежнасці суддзяў і адвакатаў

92. Спецыяльны дакладчык звяртае ўвагу ўрада на датычныя незалежнасці судовых органаў палажэнні Асноўных прынцыпаў, у якіх гаворка ідзе аб гарантаваным тэрміне знаходжання суддзяў на пасадах, і настойліва заклікае яго цалкам выконваць іх у адпаведнасці з міжнароднымі нормамі.

Рэкамендацыя адносна незалежнасці суддзяў і адвакатаў

93. Спецыяльны дакладчык заклікае адмяніць Дэкрэт Прэзідэнта № 12 "Аб некаторых мерах па ўдасканаленні адвакацкай і натарыяльнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь" і прывесці заканадаўства, якое рэгламентуе працу адвакатаў, у адпаведнасць з Асноўнымі прынцыпамі, якія датычаць ролі юрыстаў. Ад уладаў патрабуецца забяспечыць, каб юрысты "маглі выконваць усе свае прафесійныя абавязкі ў атмасферы,

свабоднай ад пагрозаў, перашкод, запалохвання або неапраўданага ўмяшальніцтва" (пункт 16).

Рэкамендацыя адносна свабоды сродкаў масавай інфармацыі

94. Спецыяльны дакладчык заклікае ўрад зняць разнастайныя адміністрацыйныя, фінансавыя і прававыя абмежаванні свабоды сродкаў масавай інфармацыі, якія ідуць уразрэз з міжнароднымі нормамі правоў чалавека. Адміністрацыйнаму пераследу ў выглядзе, напрыклад, ускоснага ціску праз выдавецтвы і сістэмы распаўсюду, павінен быць пакладзены канец, а сістэма ліцэнзавання і рэгістрацыі павінна быць карэнным чынам перагледжаная, каб прадукцыя незалежных электронных і друкаваных сродкаў масавай інфармацыі магла распаўсюджвацца як мага шырэй. Неабходна эфектыўна і цалкам спыніць прамую і ўскосную цэнзуру ва ўсіх формах у адпаведнасці з артыкулам 33 Канстытуцыі Беларусі. Неабходна правесці сур'ёзнае расследаванне выпадкаў нападу і пагроз у дачыненні да журналістаў, а да вінаватых павінны быць прынятыя санкцыі ў адпаведнасці з законам.

Рэкамендацыі адносна свабоды сходаў

95. Спецыяльны дакладчык заклікае ўрад зняць разнастайныя адміністрацыйныя, фінансавыя і прававыя абмежаванні на права асобаў і арганізацый у індывідуальным парадку або ў супрацоўніцтве з іншымі эфектыўна абараняць і заахвочваць правы чалавека ў Беларусі.

96. Сістэма рэгістрацыі арганізацый і выкарыстання замежных грантаў патрабуе прывядзення ў адпаведнасць з найвышэйшымі міжнароднымі стандартамі, выкладзенымі ў Дэкларацыі аб праваабаронцах ды іншых крыніцах міжнароднага права.

97. Неабходна праводзіць сур'ёзнае расследаванне выпадкаў нападу і пагрозаў у адрас асобных праваабаронцаў і палітычных дзеячоў і прыняць да вінаватых санкцыі ў адпаведнасці з законам. У адносінах да тых праваабаронцаў і палітычных дзеячоў, якія прыцягваюцца да адказнасці за адміністрацыйныя або крымінальныя правапарушэнні, павінны ўжывацца найвышэйшыя стандарты справядлівага судовага разгляду.

Рэкамендацыі адносна свабоды аб'яднанняў

98. Спецыяльны дакладчык спасылаецца на рэкамендацыі Камісіі па расследаванні Міжнароднай Арганізацыі Працы і настойліва заклікае ўрад неадкладна цалкам выканаць іх.

99. Спецыяльны дакладчык рэкамендуе правесці незалежны аналіз ажыццяўляемай рэформы сістэмы найму і настойліва заклікае ўрад забяспечыць, каб абумоўленыя гэтай рэформай змены кантрактнага статусу працоўных і гарантый занятасці не ўжываліся ў якасці сродку адміністрацыйнага ціску і запалохвання.

Рэкамендацыя адносна свабоды сумлення

100. Спецыяльны дакладчык заклікае ўрад прыняць эфектыўныя меры, якія забяспечылі б роўнасць усіх рэлігій у адпаведнасці з Канстытуцыяй Беларусі. Неабходна перагледзець і спрасціць складаныя працэдуры рэгістрацыі і дазволаў, каб забяспечыць рэальную роўнасць усіх рэлігійных аб'яднанняў перад законам.

Рэкамендацыя адносна палітычных правоў

101. Спецыяльны дакладчык заклікае ўрад Беларусі забяспечыць павагу да міжнародных стандартаў, якія датычаць дэмакратычных выбараў у сувязі з любым будучым выбарчым працэсам і неадкладна расследаваць усе даведзеныя да яго ведама ўнутранымі і міжнароднымі назіральнікамі звесткі аб махінацыях, звязаных з праведзенымі ў кастрычніку 2004 года выбарамі і рэферэндумам.

102. Адмова беларускіх уладаў супрацоўнічаць з Спецыяльным дакладчыкам вартая шкадавання. Разам з тым, Спецыяльны дакладчык лічыць, што, хаця яму і давялося выконваць сваю місію ў неспрыяльных умовах, яна дазволіла яму аказаць жаданую маральную падтрымку ўсім тым дэмакратычным сілам унутры Беларусі і за яе межамі, якія прыкладаюць намаганні па заахвочванні і абароне правоў чалавека. У той жа час яна, без сумнення, стала стымулам да таго, каб урадавыя органы Беларусі больш дасканала падышлі да гэтай праблемы і зразумелі, што іх адносіны з міжнароднай супольнасцю дэмакратычных краін залежаць ад здольнасці паважаць правы чалавека і паляпшаць становішча ў краіне ў гэтай галіне. Таму такія высілкі варта працягнуць.

Notes

1 Гэты ліст даступны як дакумент E/CN.4/2005/G/11.

2 Паведамленне для прэсы, зробленае Спецыяльным Прадстаўніком Генеральнага Сакратара па праваабаронцах 21 чэрвеня 2004 г.